Дзяржаўная ўстанова культуры
“Горацкая раённая бібліятэчная сетка”

Горацкая цэнтральная бібліятэка
імя М. Гарэцкага

# Каляндар знамянальных і памятных дат па Горацкаму раёну на 2023 год



Горкі 2022

*Дзяржаўная ўстанова культуры*
*"Горацкая раённая бібліятэчная сетка"*

*Горацкая цэнтральная бібліятэка*
*імя М. Гарэцкага*

# Каляндар
## знамянальных
## і памятных дат
## па Горацкаму раёну
## на 2023 год

*Горкі 2022*

У каляндары знамянальных і памятных дат Горацкага раёна на 2023 год прадстаўлены даты, якія адлюстроўваюць важнейшыя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця раёна, дзейнасць знакамітых людзей, звязаных з нашым краем.

Матэрыял размяшчаецца ў храналагічнай паслядоўнасці, кожная дата забяспечана кароткай інфармацыйнай даведкай. У выпадку неўстанаўлення дакладнай даты, інфармацыя пра яе змешчана ў раздзеле "У 2023 годзе таксама спаўняецца".

Пры падрыхтоўцы каляндара былі выкарыстаны даведачныя выданні і электронныя краязнаўчыя базы даных з фонду Горацкай цэнтральнай бібліятэкі імя М. Гарэцкага.

**Каляндар знамянальных і памятных дат па Горацкаму раёну на 2023 год** / ДУК "Горацкая раённая бібліятэчная сетка", Горацкая цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага ; складальнік Т. М. Неваднічая; адказны за выпуск А. А. Марозава. – Горкі, 2022. – 32с.

# Памятныя даты



Горы-Горацкі сельска-гаспадарчы інстытут

**175 год**

– з дня зацвярджэння рашэння Дзяржаўнага Савета аб пераўтварэнні вышэйшага разраду Горы-Горацкай землярobчай школы ў ***Горы-Горацкі земляробчы інстытут*** (30 чэрвеня 1848 г.).




**105 год**

– з дня выхаду з друку газеты ***“Известия Горецкого уездного Совета рабочих, крестьянских и солдатских депутатов”*** (жнівень 1918 г.);

– з дня, калі на на месцы былога маёнтка Раманава Горацкага павета быў арганізаваны першы саўгас – ***саўгас “Леніна”*** (1918 г.).



Горацкая раённая бібліятэка 1967 г.

**100 год**

– з дня выхаду раённай газеты ***“Горецкие известия”*** (1923 г., красавік);

– з дня адкрыцця братамі Вільнерамі публічнай бібліятэкі, якая пазней стала функцыянаваць як ***Горацкая раённая бібліятэка*** (ж нівень 1923 г.).



Палноўскі сельскі клуб-бібліятэка

**90 год**

– адбыўся першы раённы ***злёт калгаснікаў-ударнікаў*** (1933 г.).

**80 год**

– з дня адраджэння ***Горацкага лясгаса*** пасля Вялікай Айчыннай вайны(1943 г.).



Копцеўская сельская бібліятэка

**75 год**

– з дня адкрыцця ***Палноўскага сельскага клуба*** (1948 г.), з 2011 г. – Палноўскі клуб бібліятэка;

– з дня заснавання ***Копцеўскай сельскай бібліятэкі***

(1948), раней – хата-чытальня (1922);
– з дня прыняцця пастановы Савета Міністраў БССР аб пераўтварэнні ***Беларускага сельскагаспадарчага інстытута*** Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (лістапад 1948 г.).


*Ленінская сельская бібліятэка*

**70 год**
– з дня адкрыцця ***Ленінскай сельскай аб'яднанай бібліятэкі*** (1953 г.);

**65 год**
– з дня стварэння ***народнага аркестр духавых інструментаў*** пад кіраўніцт вам ***Барыса Давыдавіча Круглікава*** (існаваў у 1958-2013 гг.).
– з дня адкрыцця ***Красулінскай сельскай бібліятэкі*** (ліпень 1958 г.).


*Красулінская сельская бібліятэка*

**60 год**
– з дня адкрыцця новага памяшкання ***раённай бальніцы*** (1963 г.);
– з дня здачы ў эксплуатацыю корпуса ***факультэта механізацыі БДСГА***;
– пабудаваны ***будынак гарадской гасцініцы***, цяпер тут раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання


*Раённая бальніца 1972 г.*


*Будынак былой гасцініцы 2012 г.*


*Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія*

насельніцтва і інтэрнат для медыцынскіх работнікаў;

– з дня заснавання эксплуатацыйна-мантажнай канторы, якая ў 1975 г. была пераўтворана ў ***Горацкае міжраённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі***, а з 2014 г. – вытворчае ўпраўленне ***“Горкігаз”***(1963 г.);

– з дня стварэння ***Горацкага міжраённага атрада аховы раслін,*** затым – станцыя аховы раслін (1963 г.).



*ВУ “Горкігаз”*




*Універмаг*

**55 год**

– з дня стварэння ***будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі*** (БМУ меліярацыі), а затым ***ПМК-78*** (29 ліпеня 1968 г.);

– з дня дня адкрыцця ***музея гісторыі БДСГА*** (1968 г.);

– з дня адкрыцця ***музея савецка-польскай баявой садружнасці*** ў Леніна (15 кастрычніка 1968 г.).

**45 год**

– з дня адкрыцця новага ***універмага ў Горках*** (6 лістапада 1973 г.);




***Музей савецка-польскай баявой садружнасці***

# Памятныя даты

– з дня адкрыцця новага будынку ***Палноўскага Дома культуры***, затым з 2011 г. – Палноўскі сельскі клуб-бібліятэка (30 снежня 1973 г.);

– з дня рэарганізацыі ***Добраўскага сельскага клуба*** ў сельскі ***Дом культуры*** (1973);

– з дня адкрыцця ***Горацкага бюро падарожжаў і экскурсій*** (верасень 1973 г.).



*Палноўскі сельскі клуб-бібліятэка*

**45 год**

– з дня заснавання на базе спецкамендатуры ўстановы ***УЖ 15/16*** (13 лютага 1978 г.);

– з дня стварэння ***міжшкольнага вучэбна-вытворчага камбіната*** (лістапад 1978 г.);

– з дня адкрыцця дзіцячага ***яслі-сада райаграпрамтэхнікі “Сонейка”*** (1978 г.);

– з дня стварэння ***лесапаляўнічай гаспадаркі*** (1978 г.).

– з дня адкрыцця ***Дома быту*** па вуліцы Заслонава (1978 г.)



*Добраўскі сельскі Дом культуры*



*Дом быту*

**40 год**

– з дня адкрыцця ***яслі-сада БДСГА*** (22 красавіка 1983 г.);

– з дня адкрыцця ***яслі-сада № 5*** (18 мая 1983 г.);

– з дня здачы ў эксплуатацыю ***Палаца культуры БДСГА*** (1983 г.);




***Палац культуры БДСГАя***

# Памятныя даты

– з дня адкрыцця спецыялізаванага ***кафэ “Сняжынка”*** на тэрыторыі БДСГА (1983 г.);
– з дня адкрыцця новага ***гандлёвага цэнтра*** ў пасёлку ***Леніна*** (5 кастрычніка 1983 г.).

**35 год**

– з дня пабудавання новай ***станцыі тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў*** (СТА-5) (студзень 1988 г.);
– з дня стварэння ***Таварыства інвалідаў*** (чэрвень 1988 г.);
– з дня, калі ***раённая дзіцячая бібліятэка*** атрымала новае памяшканне ў будынку рэдакцыі “Ленінскі шлях” па вуліцы Савецкая, дом 8 (1988);
– з дня правядзення першай экскурсіі для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны (1 мая 1988 года) і адкрыцця ***Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея*** (1 ліст апада 1988 г.);
– з дня адкрыцця ***дзіцячага сада-яслі*** на 280 месцаў будаўнічага аб’яднання МПМК-251 (1988);
– з дня стварэння ***народнага ансамбля народнай песні “Весялосць”*** пры Маслакоўскім сельскім



*Раённая дзіцячая бібліятэка*



*Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей*



***Народны ансамбль народнай песні “Весялосць”***

Доме культуры (1988);
- з дня ўвядзення ў строй новага ***водазабора са станцыяй абезжалезівання,*** хларыравання і фтарыравання вады (1988);
- з дня стварэння на базе клуба “Жывое слова” ***народнага аматарскага аб’яднання “Роднае слова”*** пры Горацкім гісторыка-этнаграфічным музеі (1988);
- з дня ***адкрыцця магазінаў*** гархарчпрамгандлю: магазіна будаўнічых матэрыялаў і магазіна гаспадарчых тавараў (1988);
- з дня пабудавання ***інтэрната АПТ-17*** на 100 месцаў (1988);



*У фае Горацкай раённай бібліятэкі імя М. Гарэцкага. 1993 г.*

**30 год**
- з дня прысваення імя Максіма Гарэцкага ***Горацкай раённай бібліятэцы*** (1.02.1993 г.);
- з дня прыняцця рашэння Горацкім гарадскім Саветам дэпутатаў аб перайменаванні вуліцы “40 год Кастрычніка” ў ***вуліцу імя Максіма Гарэцкага*** (люты 1993 г.);
- з дня аднаўлення дзейнасці ***раённага краязнаўчага таварыства*** (3 чэрвеня 1993 г.)
- з дня адкрыцця ***Аўсянкаўскага філіяла*** Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея (1993);
- з дня рэарганізацыі Горацкага машынабудаўнічага завода ў дзяржаўнае прадпрыемства **“Прэма”** (1993 г.).
- з дня адкрыцця ***помніка сельскаму працаўніку***, устаноўленаму ля кінатэатра “Крыніца” (1993).




*Эмблема ДУП “Прэма”*



*ПУП “Праметэй”*

**25 год**
- з дня стварэння прыватнага ўнітарнага прадпрыемства ***“Праметэй”*** (люты 1998 г.);
- з дня, калі ***вузлы паштовай і электрычнай сувязі*** сталі самастойнымі арганізацыямі;
- з дня прыняцця Указа Прэзідэнта Рэспублікі



*Вузел паштовай сувязі*



*Народнае аматарскае аб'яднанне “Лазінка”. 2008 г.*



*Народны фальклорны ансамбль “Паршынскія зоры”*



*Адкрыццё аграгарадка Рэкта*



*Азеляненне ў Горках*

Беларусь № 563 ад 1 снежня 1998 г. на падставе якога Горацкі раён і горад Горкі аб’яднаны ў адну ***адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку – Горацкі раён*** з адміністрацыйным цэнтрам горад Горкі (1 снежня 1998 г.);

– з дня прысваення ***аматарскаму аб’яднанню “Лазінка”*** пры Доме рамёстваў звання ***“народны аматарскі калектыў”*** (1998).

**20 год**

– з дня ўтварэння ***Горацкай цэнтралізаванай клубнай сістэмы*** (1 мая 2003 г.);

– з дня ўтварэння ААТ ***“Горацкая райаграпрамтэхніка”*** на базе ААТ “Райаграпрамтэхніка”, райсельгасхіміі і райаграпрамснаба (2003);

– з дня, калі ***цяплічная гаспадарка УКПП “Камунальнік”*** набыла статус незалежнасці (2003).

**15 год**

– з дня прысваення ***фальклорнаму ансамблю “Паршынскія зоры”*** пры Паршынскім Цэнтры культуры звання ***“народны аматарскі калектыў”*** (2008);

– з дня прысваення ***вакальнаму ансамблю “Мярэя”*** пры РЦК звання ***“народны аматарскі калектыў”*** (2008);

– з дня правядзення І-га агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці працоўных калектываў раёна ***“Працуй і спявай, наш Горацкі край”*** (2008);

– з дня ўтварэння ***аграгарадкоў Маслакі і Рэкта*** (2008 г.).

**10 год**

- з дня ўтварэння на базе трох аддзелаў райвыканкама – ідэалагічнай работы, культуры і

# Памятныя даты



*Фестываль дзіцячай творчасці “Славянскі карагод-2013”*



*Дзіцячы хор “Кантылена”*



*Святкаванне Дня вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 2014 г.*

аддзела па справах моладзі – ***аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі*** (1 ліпеня 2013 г.);

- з дня ўтварэння ***ДУК “Горацкая раённая бібліятэчная сетка”*** на базе цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, у складзе якой налічвалася 24 установы (1 ліпеня 2013);
- з дня заснавання дзіцячай ***студыі батлейкі “Дзіва”*** пры ДУА “Горацкая дзіцячая школа мастацтваў і мастацкіх рамёстваў” (2013);
- з дня прысваення хору старэйшых класаў ***“Кантылена”*** і эстраднай студыі ***“Ступені майстэрства” ДУА “Дзіцячая вакальна-харавая школа мастацтваў г. Горкі”*** звання “узорны калектыў” (2013).
- з дня ўтварэння ***ДУК “Горацкая раённая бібліятэчная сетка”*** на базе цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, у складзе якой налічвалася 24 установы (1 ліпеня 2013);

# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры

## 105 год

**Гарэцкі, М.** Руска-беларускі слоўнік (Смаленск, 1918).

## 95 год

**Гарэцкі, М.** Мастацкая проза сучасных маладнякоўцаў (Мінск, 1928).

## 65 год

**Булахаў, М.** Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX-XX стст. ва ўзаемаадносінах з




іншымі славянскімі мовамі (Мінск, 1958).

## 50 год

**Булахаў, М.** Гісторыя прыметнікаў беларускай мовы. Ч. 3 (Мінск, 1973).

**Разгон, Л.** Один год и вся жизнь (Москва, 1973).

## 45 год

**Булахаў, М.** Асноўныя этапы развіцця славянскага мовазнаўства ў Расіі (да 1917 г.) (Масква, 1978).

**Разгон, Л.** Повести (Москва, 1978).

## 40 год

**Прохараў, А.** Вуркаток (Мінск, 1983).

**Разгон, Л.** Московские повести (Москва, 1983).

## 30 год

**Варюхина**, С. Счастливый бумеранг (Минск, 1993).

**Ковалева Н**. Напиток певчих птиц (Горки, 1993).

**Лившиц, В.** Горки и окрестности (Орша, 1993).

**Ліўшыц У.** Максім Гарэцкі – жыццё і творчасць (Магілёў, 1993).

## 25 год

**Жилин М. Я.** Плавать по морю необходимо... (1998).

**Ковалева Н.** Есть у дождика подружка (Минск, 1998).

**Лившиц, У.** Четырежды почетный (Горки, 1998).

**Ліўшыц У.** Сын вёскі : кароткі нарыс аб жыцці і творчасці пісьменніка ***В. Каваля*** **(**Орша**,** 1998**).**

## 35 год

**Прохараў, А.** Птушыны гарадок (Мінск, 1988).

**Разгон, Л.** История продолжается (Москва, 1988).

## 20 год

**Гарэцкі, М.** Прысады жыцця (Мінск, 2003).

**Киселев, С.** Дорога домой (Минск, 2003).

**Клачкоў А. В.** Вечныя пытанні (Горкі, 2003).




# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры

**Ковалева Н.** Зов любви : стихи (Горки, 2003).

## 15 год

**Кавалёва Н.** Кветкі багародзіцы (Горкі, 2008).
**Клачкоў, А.** Наша зямля (Магілёў, 2008).
**Родная Л.** Любоў – крылатая істота (Горкі, 2008).
**Сілін, У.** Сібірскі далягляд (Навасібірск, 2008).
**Терешко С.** Земная суть (Горки, 2008).

## 10 год

**Андрэева, Л.** І боль, і мары, і любоў (Мінск, 2013).
**Васильев Л.** Дорогой жизни (Минск, 2013).
**Кавалёва Н.** Голас вякоў (Мінск, 2013).
**Киселев, С.** Осенние цветы (Горки, 2013).
**Клочков А.** Сталкер (Горки, 2013).
**Лившиц, В.** Гордость и слава Горецкой земли. Книга 1. (Горки, 2013).
**Лившиц, В.** Александр Риммович Цыганов (Минск, 2013).
**Лившиц, В.** С Горками и академией связаны судьбой. Кн. 1 (Горки, 2013).
**Ліўшыц, У.** Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія: гісторыя і сучаснасць.100 пытанняў і адказаў (1840–1919). Ч. 2. (Горкі, 2013).
**Ліўшыц, У.** Горацкая студыя “Аршанскага Маладняка” (Горкі, 2013).
**Самусенко, Л.** Пережитое (Горки, 2013).

## У 2023 г. спаўняецца:



*Муравін Р. М.*



*Лубяка П. С.*



*Іофе І. А.*

**165 год** з дня нараджэння **БЫЧКОВА ЯЎГЕНА ІВАНАВІЧА** (1858, г. Горкі Магілёўскай губ. – ?), удзельніка нарадавольніцкага руху 1870-80-х гадоў.

**140 год** з дня нараджэння **МУРАВІНА РЫГОРА МАЙСЕЕВІЧА** (1883, г. Горкі – 1969), рэвалюцыянера, дэлегата ІІ Усерасійскага з’езда Саветаў.

**135 год** з дня нараджэння **ЛУБЯКА ПАЛАГЕІ СЯМЁНАЎНЫ** (1888, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 1975), заслужанай настаўніцы БССР.

**130 год** з дня нараджэння **ЛЯОНЕНКІ ІСАКА ЯЎСЕЕВІЧА,** (1893, в. Горы, Горацкага пав. – 1975), удзельніка грамадзянскай вайны, дэлегата 2-га Усерасійскага з’езда Саветаў.

**120 год** з дня нараджэння **МАНА ІВАНА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (1903 – 1982 г), капітана далёкага плавання, ганаровага палярніка СССР. Удзельнік Першай паўночна-ўсходняй палярнай экспедыцыі СССР. У 1957—1958 гг. здзейсніў кругасветнае плаванне з навуковай экспедыцыяй на борце электрахода «Об».

**110 год** з дня нараджэння **МАЗУРА СЯРГЕЯ АКІМАВІЧА** (1913, с. Агіеўка Ружынскага раёна Жытомірскай вобласці.), аднаго з арганізатараў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў Айчынную вайну, першага сакратара Горацкага РК КПБ ў 1953-1956 гг.



*Шыцікаў Пецця*



*Вераб'ёў Жэня*



*Крывіцкая (Макеева) Т.*



*Іваноў Г. Ф.*

**100 год** з дня нараджэння **ІОФФЕ ІЗРАІЛЯ АБРАМАВІЧА** (1923, г. Горкі), вучонага, доктара тэхнічных навук (1978), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

**100 год** з дня нараджэння **ЛАСКЕВІЧ НІНЫ ІВАНАЎНЫ** (1923, г. Горкі – 11.9.1943), падпольшчыцы, разведчыцы партызанскай брыгады "Чэкіст".

**100 год** з дня нараджэння **НОВІКАВАЙ КАЦЯРЫНЫ ФЁДАРАЎНЫ** (1923, в. Шапялёўка Горацкага р-на, Магілёўскай вобл.), педагога, аранжыроўшчыка кветак, майстара дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**95 год** з дня нараджэння **ШЫЦІКАВА ПЕЦІ** (1928, в. Палёнка Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 20.10.1943), члена падпольнай камсамольскай групы Ліхачоўскай МТС, партызана 17-й партызанскай брыгады.

**95 год** з дня нараджэння **ВЕРАБ'ЁВА ЯЎГЕНА** (1928, в. Рэкатка Горацкага р-на – 1.06.1944), шасцікласніка Панкратаўскай сярэдняй школы Горацкага р-на, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

## *Студзень*

**1** – **105 год** з дня нараджэння **КРЫВІЦКАЙ (МАКЕЕВАЙ) ТАЦЦЯНЫ ЯКАЎЛЕЎНЫ** (1.01.1918, в. Цімохава Вялікалуцкага раёна Пскоўскай вобл., Расія – 2014, г. Горкі), заслужанага ўрача БССР.

**2** – **110 год** з дня нараджэння **УГНАЧОВА ФЁДАРА АНТОНАВІЧА** (2.01.1913, в. Слабада Горацкага пав. Магілёўскай губ. – 18.04.1978), Героя Савецкага Саюза.



Сцебут І. А.

**6** – **130 год** з дня нараджэння **ІВАНОВА ГЕОРГІЯ ФЁДАРАВІЧА** (6.01.1893, в. Горы Горацкага пав. Магілёўскай губ. – 11.01.1955, г. Масква), доктара-медыцынскіх навук, прафесара.

16 – **70 год** з дня нараджэння **ПАПЫТАЕВА АЛЯКСАНДРА ІВАНАВІЧА** (16.01.1953, п. Чырвоны Яр Жырноўскага р-на Валгаградскай вобл.), інжынера, грамадскага дзеяча.



Тулупава Н.

31 – **190 год** з дня нараджэння **СЦЕБУТА ІВАНА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (31.01.1833, г. Вялікія Лукі, цяпер Пскоўскай вобл., Расія – 20.10.1923, г. Масква), рускага і беларускага вучонага-аграномa, педагога, аднаго з заснавальнікаў раслінаводства на Беларусі, прафесара Горы-Горацкага земляробчага інстытута (1860), грамадскага дзеяча.



Фабрыстаў У. Я.

## *Люты*

**1** – **85 год** з дня нараджэння **ТУЛУПАВАЙ (ЛІСОЎСКАЙ) НЭЛІ ІВАНАЎНЫ** (1.02.1938, в. Капань Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. – 30.07.2001), паэтэсы, празаіка, перакладчыцы, Члена Саюза пісьменнікаў, супрацоўніцы рэдакцыі газеты “Советский студент” БСГА.

# Памятныя даты

## Люты



Мядзведскі Ф. Д.



Мядзведзеў Ф. Д.



Гарэцкі М. І.

**3** – **100 год** з дня нараджэння **ФАБРЫСТАВА УЛАДЗІМІРА ЯКАЎЛЕВІЧА** (3.02.1923, Горкі Магілёўскай вобл. – 3.02.2013), педагога, грамадскага дзеяча, старшыні Горацкага райвыканкама ў 1963-1965 гг.

**4** – **120 год з дня нараджэння ЛІШЧАНКІ ФЁДАРА ІГНАТАВІЧА** (4.02.1903, г.п. Самбек Растоўскай вобл., Расія – 22.7.1980), беларускага вучонага ў галіне раслінаводства, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БСГА.

**5** – **110 год** з дня нараджэння **МЯДЗВЕДСКАГА ФЁДАРА ДАНІЛАВІЧА** (5.02.1913, в. Міхайлавічы Горацкага пав. – 26.04.1988), журналіста, партыйнага і грамадскага дзеяча, персанальнага пенсіянера, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, першага сакратара першай камсамольскай ячэйкі ў першым калгасе Горацкага раёна.

**12** – **85 год** з дня нараджэння **МЯДЗВЕДЗЕВА РЫГОРА ФЁДАРАВІЧА** (12.02.1938, в. Харошаўка Добрушскага р-на Гомельскай вобл.), беларускага вучонага ў галіне ветэрынарыі, акадэміка Міжнароднай акадэміі аграрнай адукацыі, доктара ветэрынарных навук, прафесара БДСГА.

**12** – **130 год** з дня нараджэння **ЗІЛЬБЕРТА БЕНА** (12.02.1893, Горкі Магілёўскай губ. – 1939, Фларыда, ЗША), мастака, гравёра.

**17** – **125 год** з дня нараджэння **ЗУБРЫЦКАГА ІВАНА ВАСІЛЬЕВІЧА** (17.02.1898, г. Рэчыца Гомельскай вобл. – 25.11.1963), беларускага вучонага-геадэзіста,


*Курапаценка Ф. К.*


*Пакуш Л. У.*


*Хін-Гальдоўская Р. М.*


*Багдановіч Т. А.*


*Бухаркін А. В.*

прафесара БСГА.

**18** – **130 год** з дня нараджэння **ГАРЭЦКАГА МАКСІМА ІВАНАВІЧА** (18.02.1893, в. Багацькаўка Мсціслаўскага р-на – 10.02.1938), беларускага пісьменніка, фальклярыста, грамадскага дзеяча, творчасць якога цесна звязана з Горацкім краем.

## *Сакавік*

**2** – **120 год** з дня нараджэння **КУРАПАЦЕНКІ ФЁДАРА КУЗЬМІЧА** (2.03.1903, в. Малыя Бялевічы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ. – 16.05.1993), вучонага ў галіне землеўпарадкавання, заслужанага работніка вышэйшай школы.

**9** – **80 год** з дня нараджэння **ПАКУШ ЛАРЫСЫ УЛАДЗІМІРАЎНЫ** (9.03.1943, г. Вольск Саратаўскай вобл.), доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА, ганаровага прафесара Паўночна-Казахстанскага ўніверсітэта, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан (1997-2006).

**9** – **160 год** з дня нараджэння **ХІН-ГАЛЬДОЎСКАЙ РАШЭЛІ МІРОНАЎНЫ** (9.03.1863, г. Горкі Магілёўскай губ. – 12.12.1928, г. Масква), пісьменніцы, драматурга.

**23** – **70 год** з дня нараджэння **БАГДАНОВІЧ ТАМАРЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ** (23.03.1953, г. Горкі Магілёўскай вобл.), народнага майстара лозапляцення (2007), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі



Васільеў А. З.



Разгон Л. Э.



Савіцкая М. З.



Салянік А. У.

Беларусь (2006).

**29** – **95 год** з дня нараджэння **БУХАРКІНА АНАТОЛЯ ВІКТАРАВІЧА** (29.03.1928, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 15.06.2013, г. Лепель), інжынера лясной гаспадаркі, беларускага самадзейнага мастака (пейзажы і нацюрморты).

**31** – **125 год** з дня нараджэння **ДРОЖНІКАВА ВАСІЛЯ ГАЎРЫЛАВІЧА** (31.03.1898 – 23.05.1982), удзельніка грамадзянскай вайны, аднаго з арганізатараў Чырвонай Гвардыі, выкладчыка БСГА.

## *Красавік*

**1** – **100 год** з дня нараджэння **ВАСІЛЬЕВА АФАНАСІЯ ЗАХАРАВІЧА** (1.04.1923, в. Палёнка Горацкага р-на – 3.01.1992), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, камандзіра партызанскага атрада.

**1** – **115 год** з дня нараджэння **РАЗГОНА ЛЬВА ЭМАНУІЛАВІЧА** (1.04.1908, г. Горкі Магілёўскай губ. – 8.09.1999, г. Масква), савецкага пісьменніка, літаратурнага крытыка. праваахоўніка.

**16** – **95 год** з дня нараджэння **САВІЦКАЙ МАРГАРЫТЫ ЗАХАРАЎНЫ** (16.04.1928, г. Горкі Магілёўскай вобл.), мастака, члена Саюза мастакоў СССР.

**17** – **65 год** з дня нараджэння **САЛЯНІКА АЛЯКСАНДРА УЛАДЗІМІРАВІЧА** (17.04.1958, г. Мсціслаў Магілёўскай вобл.), беларускага вучонага ў галіне сельскагаспадарчых навук, доктара


Балабава А. К.


Дольнікаў Р. У.


Грабчыкаў С. М.


Грыбкоў М. І.

сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.

**20** – **80 год** з дня нараджэння **ГОЛЧАНКІ МІХАІЛА ГЕРАСІМАВІЧА** (20.04.1943, в. Плешчыцы Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), беларускага вучонага ў галіне меліярацыі.

**23** – **95 год** з дня нараджэння **БАЛАБАВАЙ АЛЯКСАНДРЫ КІРЫЛАЎНЫ** (23.04.1928, в. Калінаўка Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), перадавіка сельскагаспадарчай вытворчасці, Героя Сацыялістычнай Працы.

**25** – **95 год** з дня нараджэння **ДЗІВАКОВА МІКАЛАЯ ГАЎРЫЛАВІЧА** (25.04.1928, в. Арлы Горацкага р-на), заслужанага будаўніка БССР.

## *Май*

**8** – **100 год** з дня нараджэння **ДОЛЬНІКАВА РЫГОРА УСЦІНАВІЧА** (8.05.1923, в. Сахараўка Горацкага р-на – 23.03.1996, г. Масква), Героя Савецкага Саюза, генерал-палкоўніка авіяцыі, заслужанага ваеннага лётчыка СССР, Ганаровага грамадзянін г. Горкі.

**13** – **100 год** з дня нараджэння **ГРАБЧЫКАВА СЦЯПАНА МІТРАФАНАВІЧА** (13.05.1923, в. Логвіна Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 14.05.1994), мовазнаўцы.

**25** – **115 год** з дня нараджэння **ГРЫБКОВА МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА** (25.05.1908, г.п. Елацьма Касімаўскага р-на Разанскай вобл. – 25.01.1989), Героя Савецкага Саюза (1945), Ганаровага грамадзяніна горада Горкі,

удзельніка вызвалення Горацкага раёна ў 1944 годзе.

***Чэрвень***

– **135 год з** дня нараджэння **ДЗЯМ’ЯНАВА МІТРАФАНА МІХАЙЛАВІЧА** (чэрвень 1888, г. Горкі Магілёўскай губ. – 1941, Ленінград (па іншых звестках: 1889 –студзень 1942), савецкага скульптара.



*Дайнека А. Я.*

**18 – 55 год** з дня нараджэння **ДАЙНЕКІ АЛЯКСЕЯ ЯЎГЕНАВІЧА** (18.06.1968, г. Горкі), беларускага вучонага-эканаміста, доктара эканамічных навук, акадэміка Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій, прафесара БДСГА.



*Ніканава Н. І.*

**19 – 125 год** з дня нараджэння **САВІЦКАГА МАРКЕЛА СЦЯПАНАВІЧА** (19.06.1898, в. Расасна Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. – 24.07.1975), вучонага ў галіне раслінаводства, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БСГА.

**24 – 65 год** з дня нараджэння **СТАСЬКО ВЯЧАСЛАВА АНАТОЛЬЕВІЧА** (24.06.1958), дырэктара ААТ “Будаўнік”, Ганаровага будаўніка Рэспублікі Беларусь, “Чалавека года-2003” Магілёўшчыны.



*Пратасаў М. І.*

**25 – 90 год** з дня нараджэння **НІКАНАВАЙ НІНЫ ІВАНАЎНЫ** (25.06.1933, в. Сцяфанава Горацкага раёна – 26.11.2003), Героя Сацыялістычнай Працы (1981), заслужанага работніка сельскай гаспадаркі БССР.

**25 – 90 год** з дня нараджэння **ПРАТАСАВА МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА** (25.06.1933, с.


Слука А. Я.

Пералазы Краснагорскага р-на Бранскай вобл., Расія), беларускага вучонага ў галіне земляробства і аховы раслін, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.

**26** – **100 год** з дня нараджэння **СЛУКІ АЛЯКСАНДРА ЯЎГЕНАВІЧА** (26.06.1923, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 11.08.2007, г. Масква), вучонага-географа, краіназнаўцы, доктара геаграфічных навук), заслужанага прафесара МДУ імя М. Ламаносава.


Стальмашонак І. М.

## *Ліпень*

**19** – **105 год** з дня нараджэння **СТАЛЬМАШОНКА ІЛЛІ МАЙСЕЕВІЧА** (19.07.1918, в. Хімнае Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. – 12.10.1998), кандыдата тэхнічных навук, дацэнта БСГА, краязнаўцы, Ганаровага грамадзяніна г. Горкі.


Люхцікаў А. С.

**27** – **125 год** з дня нараджэння **ЛЮХЦІКАВА АНІСІМА СЦЯФАНАВІЧА** (27.07.1898, в. Кузавіна Горацкага пав. – 6.11.1976), генерал-маёра, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

## *Жнівень*


Бойка Б. В.

**6** – **100 год** з дня нараджэння **БОЙКІ БАРЫСА БАРЫСАВІЧА** (6.08.1923, в. Ходараўка Горацкага раёна – 29.08.1999), беларускага фізіка, члена-карэспандэнта АН БССР, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара.

**8** – **120 год** з дня нараджэння **ЦЕЛЬПУХОЎСКАГА БАРЫСА**


Цельпухоўскі Б. С.


Мельнік С. П.


Калмыкоў В. Ф.


Афіцэраў П. І.

**СЯМЁНАВІЧА** (08.08.1903, в. Чашнікі Горацкага раёна Магілёўская вобл.), ваеннага гісторыка, прафесара, генерал-маёра, заслужанага дзеяча навукі РСФСР.

13 – **140 год** з дня нараджэння **МЕЛЬНІКА СЦЯПАНА ПАЎЛАВІЧА** (13.08.1883, с. Засулле Лохвіцкага р-на Палтаўскай вобл., Украіна – 28.06.1938), беларускага вучонага ў галіне батанікі і лесаводства, члена-карэспандэнта АН Беларусі, доктара біялагічных навук, прафесара БСГА.

13 – **85 год** з дня нараджэння **КАЛМЫКОВА ВАСІЛЯ ФЁДАРАВІЧА** (13.08.1938, г. Пагар Бранскай вобл.), беларускага вучонага, кандыдата сельскагаспадарчых навук, прафесара, члена навукова-тэхнічнага савета Камітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

15 – **70 год** з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНАВА СЯРГЕЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА** (15.08.1953, в. Балбасава Аршанскага р-на), вучонага ў галіне эканомікі, доктара эканамічных навук, прафесара БДСГА.

18 – **95 год** з дня нараджэння **АФІЦЭРАВА ПЯТРА ІВАНАВІЧА** (18.08.1928, в. Стрыкілі Горацкага раёна Магілёўскай вобл.), перадавіка сельскагаспадарчай вытворчасці, Героя Сацыялістычнай Працы.

19 – **135 год** з дня нараджэння **ТРЭЙВАСА АРОНА БАРЫСАВІЧА** (19.08.1888, г. Белеў

Тульскай губ., Расія – 1957), прафесара БСГА, доктара сельскагаспадарчых навук, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі.



*Баравікоў А. В.*

**25** – **95 год** з дня нараджэння **МІРОНЧЫКАВА ЛЕАНІДА ЦІТАВІЧА** (25.08.1928, в. Запруддзе Горацкага раёна Магілёўскай вобл.), кандыдата гістарычных навук (1969), дацэнта кафедры гісторыі СССР БДУ, аўтара кніг па старажытной славянскай літаратуры.

## *Верасень*

**12** – **70 год** з дня нараджэння **БАРАВІКОВА АЛЕГА ВАСІЛЬЕВІЧА** (12.09.1953, г. Чавусы Магілёўскай вобл.), самадзейнага мастака.



*Тарануха Р. І.*

**25** – **90 год** з дня нараджэння **ТАРАНУХІ РЫГОРА ІВАНАВІЧА** (25.09.1933, п. Вазнясенск Клімаўскага р-на Бранскай вобл., Расія), беларускага вучонага ў галіне селекцыі і генетыкі сельскагаспадарчых раслін, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА. Акадэміка Міжнароднай акадэміі аграрнай адукацыі, заслужанага дзеяча навук Беларусі.



*Кузняцоў Ф. І.*

**29** – **125 год** з дня нараджэння **КУЗНЯЦОВА ФЁДАРА ІСІДАРАВІЧА** (29.09.1898, в. Балбечына Горацкага пав. – 22.03.1961, г. Масква), савецкага военачальніка, генерал-палкоўніка (1941).

## *Кастрычнік*



*Яўмененка Ф. К.*

**9** – **115 год** з дня нараджэння **ЯЎМЕНЕНКІ ФЕЛІКСА КУПРЫЯНАВІЧА** (9.10.1908, в. Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл.– 1986), мастака, члена Саюза мастакоў СССР.

**14** – **95 год** з дня нараджэння **НАЗАРАВА СЯРГЕЯ ІВАНАВІЧА** (14.10.1928, в. Барадзіно Дубровенскага р-на Віцебскай вобласці – 11.08.1999), беларускага вучонага ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, акадэміка УАСГНІЛ, доктара тэхнічных навук, прафесара, былога рэктара БСГА.



*Назараў С. І.*

## *Лістапад*

**1** – **175 год** з дня нараджэння **АЗАРЭВІЧА ДЗМІТРЫЯ ІВАНАВІЧА** (1.11.1848, г. Горкі – 1912), расійскага вучонага, юрыста, даследчыка Антычнага Рыма і Рымскага права.



*Азарэвіч Д. І.*

**5** – **135 год** з дня нараджэння **МАНДРЫКАВА МІХАІЛА СЯРГЕЕВІЧА** (5.11. 1888, мяст. Горы Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер вёска Горацкага р-на – 2.02.1920, Нова-Марыінск Камчацкай вобл.), удзельніка ўстанаўлення савецкай улады на Чукотцы, першага старшыні рэвалюцыйнага камітэта Чукоткі.



*Мандрыкаў М. С.*

**6** – **90 год** з дня нараджэння **МЕЛЬНІЧУКА ДЗМІТРЫЯ ІВАНАВІЧА** (6.11.1933, с. Гарадзішча Бахмацкага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна), беларускага вучонага ў галіне раслінаводства, кандыдата сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.

**7** – **85 год** з дня нараджэння **ЗАЙЦАВА ДЗМІТРЫЯ ПЛАТОНАВІЧА** (7.11.1938, в. Буліна Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. – 30.01.2016), дырэктара Ленінскай сярэдняй

школы (1967-1975), намесніка старшыні Горацкага райвыканкама (1975-1995), старшыні Горацкага раённага Савета дэпутатаў (1995-1999).


Муравін С. М.

**12 –** **135 год** з дня нараджэння **МУРАВІНА САЛАМОНА МАЙСЕЕВІЧА** (12.11.1888, г. Горкі – 1938), рэвалюцыянера, грамадскага дзеяча.


Міхеева Т. М.

**13 –** **85 год** з дня нараджэння **МІХЕЕВАЙ ТАМАРЫ МІХАЙЛАЎНЫ** (13.11.1938, в. Гарадзец Горацкага р-на), беларускага вучонага ў галіне гідрабіялогіі, альгалогіі, доктара біялагічных навук (1992), члена Міжнароднай калегіі Саветнікаў ABI (The Research Board of Advisors).


Цыганаў А. Р.

**15 –** **70 год** з дня нараджэння **ЦЫГАНАВА АЛЯКСАНДРА РЫМАВІЧА** (15.11.1953, г. Горкі Магілёўскай вобл.), беларускага вучонага ў галіне аграхіміі і аграэкалогіі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, былога рэктара БДСГА.


Іофе Б. І.

**23 –** **105 год** з дня нараджэння **ІОФЕ БАРЫСА ІСАКАВІЧА** (23.11.1918, г. Горкі – 12.12.1943), літаратуразнаўцы.

**25 –** **110 год** з дня нараджэння **ГУСЕВА ГУРЫЯ СЯРГЕЕВІЧА** (25.11.1913, в. Ізвекава Клепікаўскага р-на Разанскай вобл. – 13.12.2004), Ганаровага грамадзяніна горада Горкі.

**25 –** **95 год** з дня нараджэння **БЕЛЬСКАЙ РАГНЕДЫ ІВАНАЎНЫ** (26.11.1928, г. Горкі Магілёўскай вобл.), беларускага хіміка,


Гусеў Г. С.


Бельская Р. І.


Арціўшэўскі А. А.


Мішына Г. І.


Гарбылёва Г. І.

Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

30 – **90 год** з дня нараджэння **АРЦІШЭЎСКАГА АЛЯКСАНДРА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (30.11.1933, г. Горкі), беларускага гістолага і эмбрыёлага, доктара медыцынскіх навук, прафесара.

## *Снежань*

7 – **105 год** з дня нараджэння **МІШЫНАЙ ГАННЫ ІВАНАЎНЫ** (7.12.1918, в. Табакова Уракумскага р-на Кіраўскай вобл., Расія – 25.01.1993), Ганаровай грамадзянкі горада Горкі.

15 – **95 год** з дня нараджэння **ІСАЕНКІ УЛАДЗІМІРА ФЁДАРАВІЧА** (15.12.1928, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 2010), беларускага археолага, гісторыка, краязнаўцы.

18 –**95 год** з дня нараджэння **ГАРБЫЛЁВАЙ ГАННЫ ІВАНАЎНЫ** (18.12.1928, в. Старая Гараша, Мардовія), беларускага аграхіміка, доктара сельскагаспадарчых навук, (першая жанчына-доктар у галіне агранаміі за ўсю гісторыю акадэміі), прафесара БДСГА, Ганаровай грамадзянкі Горацкага раёна.

**720 год** – калі згадваюцца ў друкаваных крыніцах вёскі ***Горы, Сава, Шышава*** (1303);

**500 год** – калі згадваецца ў друкаваных крыніцах вёска ***Леніна*** (да 1918 г. – Раманава) (1523);

**380 год** – калі згадваецца ў друкаваных крыніцах вёска ***Ходараўка*** (што зараз у Аўсянкаўскім сельскім Савеце) у складзе Кішчаўскага

войтаўства Шклоўскага графства (1643);

**355 год** – калі згадваецца ў друкаваных крыніцах вёска ***Сялец*** (1668);

**340 год** – калі згадваюцца ў друкаваных крыніцах вёскі ***Акушкі*** (в. Акушкіна), ***Альхавец***, ***Аршані***, ***Арлы***, ***Балбечына***, ***Валынцава***, ***Галёнкі***, ***Гушчына***, ***Клімацічы***, ***Красуліна***, ***Лугіны***, ***Малькі***, ***Маралёўка*** (в. Муралёўка), ***Мацюты***, ***Панкратаўка***, ***Папкоўка*** (Папоўка), ***Пнеўшчына***, ***Пуплы***, ***Рудкаўшчына***, ***Сахараўка***, ***Стан*** (в. Станок), ***Студзянец***, ***Сураўцова***, ***Улляшына***, ***Чапялінка***, ***Шавароўка***, ***Шарыпы Вялікія***, якія знаходзіліся ў складзе казённага маёнтка Горы (1683);

**335 год** – калі згадваецца ў друкаваных крыніцах вёска ***Грывец***, як сяло ў складзе маёнтка Сялец (1688);

**175 год** – калі згадваецца ў друкаваных крыніцах вёска ***Сураўцова***, як маёнтак Аршанскага павета (1848);

**165 год** – калі згадваецца ў друкаваных крыніцах вёска ***Стрыкілі***, як сяло Горацкага павета (1858).

2023 год адзначаны шматлікімі знамянальнымі і памятнымі датамі з гісторыі Горак і Горацкага раёна. Шэраг прадпрыемстваў і ўстаноў горада адзначаць свае юбілейныя даты. Таксама грамадскасць нашага края будзе адзначаць юбілейныя даты нашых слаўных ураджэнцаў і

землякоў.

З гэтай мэтай прапануем правесці наступныя мерапрыемствы краязнаўчай тэматыкі:

- ***вечары-партрэты***, прысвечаныя П. Афіцэраву, Н. Ніканавай К. Новікавай, М. Гарэцкаму, Л. Разгону, Р. Дольнікаву і інш.;
- ***літаратурныя вечары,*** прысвечаныя Б. Іофе, М. Грабчыкаву, М. Гарэцкаму, Л. Разгону, .А. Тулупавай, Р. Хін-Гальдоўскай;
- ***урокі мужнасці***, прысвечаныя А.З. Васільеву, Я. Вераб'ёву, М. Грыбкову, Р. Дольнікаву, Ф. Кузняцову, Н. Ласкевічі інш.;
- ***завочныя падарожжы*** "Край, дзе я жыву" (па бібліятэках-юбілярах, Горацкаму лясгасу, музею савецка-польскай баявой садружнасці, гісторыка-этнаграфічнаму музею);
- ***краязнаўчыя гадзіны*** "Гартаючы старонкі гісторыі краю";
- ***краязнаўчыя віктарыны*** "Ці ведаеце вы свой край?";
- ***бібліятэчныя выставы*** ("Мой край у лёсе Беларусі"; "БДСГА – кузня кадраў");
- ***бібліятэчныя выставы*** кніг-юбіляраў ураджэнцаў краю і мясцовых аўтараў;
- ***інфармацыйныя лісткі*** да дня нарадж эння юбіляраў;
- ***бібліяграфічныя агляды.***

Да 100-годдзя з дня выхаду раённай газеты можна падрыхтаваць **выставу перыядычных выданняў** Беларусі "Беларуская перыёдыка сёння" і правесці **прэзентацыю** раённай газеты "Горацкі веснік".

Да 100-годдзя з дня адкрыцця братамі Вільнерамі публічнай бібліятэкі, якая пазней стала функцыянаваць як ***Горацкая раённая бібліятэка.***

*Каляндар*
*знамянальных*
*і памятных дат*
*па Горацкаму раёну*
*на 2023 год*

Складальнік: Т. Неваднічая

Адказны за выпуск: А. Марозава

Надрукавана на аргтэхніцы Горацкай Цэнтральнай бібліятэкі
імя М. Гарэцкага

Горацкая цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага.
Вул. Якубоўскага, 40, 212410, Горкі.
***E-mail*: gorkilib@tut.by.**
www.**lib-gorki.mogilev.by**

Дзяржаўная ўстанова культуры
"Горацкая раённая бібліятэчная сетка"

Горацкая цэнтральная бібліятэка
імя М. Гарэцкага

